*А. Дз. Русін*
Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, Мінск

*A. Rusin*
Belarusian State University, Minsk

**УДК 94(476)“1944|1965”+329.733(476)“1944|1965”**

# СТАТУС ПРАФЕСІЙНАЙ ГРУПЫ МЕХАНІЗАТАРАЎ СЯРОД СЕЛЬСКАГА НАСЕЛЬНІЦТВА БССР У 1944–1965 ГГ.

# STATUS OF THE PROFESSIONAL GROUP OF MECHANIZERS AMONG THE RURAL POPULATION OF THE BSSR IN 1944–1965 YEARS

*У дадзеным артыкуле разгледжана прафесія механізатара як адзін са шляхоў вертыкальнай узыходзячай мабільнасці сельскага насельніцтва БССР у 1944–1965 гг., праз крытэрыі сацыяльнай стратыфікацыі выялены прычыны сацыяльнага ўзыходжання сельскага жыхара БССР пры атрыманні прафесіі механізатара. Зроблена выснова аб тым, што на працягу 1944–1965 гг. прафесія механізатара садзейнічала павышэнню дахода сельскага жыхара, прэстыжу, адукацыйнага ўзроўню, а таксама актыўна далучала да дзейнасці партыйных і камсамольскіх арганізацый.*

*Ключавыя словы: механізатары; прэстыж; мабільнасць; сельскае насельніцтва БССР.*

*This article examines the profession of a machine operator as a way of social mobility of the rural population of the BSSR in 1944–1965, according to the criteria of social stratification, the reasons for the social ascent of a rural resident of the BSSR when obtaining the profession of a machine operator are revealed. It is concluded that during 1944-1965 the profession of a machine operator helped to increase the income of a rural resident, prestige, educational level, and also actively joined the activities of party and Komsomol organizations.*

*Keywords: machine operators; prestige; mobility; rural population of the BSSR.*

Праблематыка сацыяльнай мабільнасці сельскага насельніцтва БССР у 1944–1965 гг. не стала на сённяшні дзень аб’ектам вывучэння ў айчыннай гістарыяграфіі. У савецкай гістарыяграфіі, прадстаўленнай працамі Г. А. Барадача, І. В. Палуяна, назапашаны багаты факталагічны матэрыял па кадравай падрыхтоўцы работнікаў сельскай гаспадаркі, партыйным кіраўніцтве сельскагаспадарчай вытворчасці, тэмпах росту сельскай гаспадаркі. Даследчыца А. П. Бяляза разглядае пасляваенны працэс у сельскай мясцовасці БССР праз прызму будаўніцтва сацыялістычнага грамадства [2; 3]. Дастаткова добра распрацаванымі аспектамі з’яўляецца развіццё сельскай гаспадаркі ў працы М. У. Смяховіча «Сельская гаспадарка ў 1943–1991 гадах: этапы развіцця, дасягненні, вопыт» [15]. В. Л. Насевіч у сваёй працы «Традиционная белорусская деревня в европейской перспективе» указвае на ўзрастанне прэстыжу прафесіі механізатара ў пасляваенны

час, тады як праца палявода хутчэй асацыявалася з плантацыйнай гаспадаркай [10]. Аднак пытанне статуса механізатара сярод сельскага насельніцтва БССР застаецца нераскрытым у айчыннай гістарыяграфіі і патрабуе дэталёвага вывучэння.

Актуальнасць тэмы артыкула заключаецца ў тым, што пытанне сацыяльнага статуса механізатара сярод сельскага насельніцтва БССР яшчэ не было адлюстравана ў айчыннай гістарыяграфіі. Даследаванне прафесійнай групы механізатараў дазволіць вызначыць тыя сацыяльныя працэсы, якія былі характэрны для беларускай вёскі ў 1944–1965 гг. Менавіта гэты перыяд быў часам, калі сельскае насельніцтва складала большую частку насельніцтва БССР, а пасля 1965 г. адбыўся рэзкі рост гарадскога насельніцтва за кошт сельскага.

Мэтай артыкула з'яўляецца адлюстраванне сацыяльнага становішча прафесійнай групы механізатараў у сельскім насельніцтве БССР, прасачыць, якім чынам прафесія механізатара садзейнічала росту сацыяльнага статусу сельскага жыхара.

Адным са шляхоў сацыяльнай мабільнасці сельскага насельніцтва БССР з'яўлялася атрыманне механізатарскай спецыяльнасці. На працягу 1944–1965 гг. назіралася паступовая механізацыя сельскай гаспадаркі, укараненне сельскагаспадарчай тэхнікі ў калгасы і саўгасы БССР, асабліва заўважнае ў заходніх абласцях БССР. Аднак умовы дзейнасці механізатараў у 1944–1965 гг. значна адрозніваліся ў залежнасці ад перыяду. На працягу 1944–1950 гг. адбывалася пасляваеннае аднаўленне калгасаў і саўгасаў ва ўсходніх раёнаў БССР. У заходніх раёнах БССР у гэты час адбывалася калектывізацыя сельскай гаспадаркі, якая была скончана да 1952 г. Пасля пленума КПСС у верасні 1953 г. механізатары сталі тымі, хто вырашаў задачу партыйнага кіраўніцтва па ўздыму сельскай гаспадаркі. Згодна перапісу насельніцтва БССР 1959 г., механізатары складалі 5 % ад агульнай колькасці занятых у сельскай гаспадарцы. Патрэба ў механізатарскіх кадрах запатрабавала ўдзелу жачын у дадзейнай прафесіі, на пачатку 1960-х гг. прыкладна 400 жанчын працавалі механізатарамі [2, с. 133–136].

Адным з паказчыкаў больш высокага статуса працы механізатара з'яўляецца памер аплаты працы. У дачыненні да механізатараў неабходна вызначыць два перыяды: 1944–1958 гг. і 1958–1965 гг. Такі падзел абумоўлены месцам працы. Да 1958 г. механізатары працавалі на машынна-трактарных станцыях (МТС), а пасля рэформы 1958 г. уся сельскагаспадарчая тэхніка была перададзена непасрэдна калгасам і саўгасам. Па падліках даследчыка сельскай гаспадаркі БССР у 1943–1990 гг. М. У. Смяховіча, у 1962–1965 гг. заработная плата механізатараў (трактарыстаў і машыністаў) была на 110 % вышэй, чым у паляводаў, хаця ў апошніх за дадзены перыяд назіраўся рост заработнай платы на 75 %. У механізатараў жа за перыяд 1962–1965 гг. назіраўся рост заработнай платы ўсяго на 23,4 %. Аднак, як

адзначалася вышэй, памер заработнай платы ў механізатараў быў значна вышэй, чым у некваліфікаваных работнікаў сельскай гаспадракі. Аднак перыяд у пачатку 1960-х гг. з'яўляецца часам рэарганізацыі сельскай гаспадаркі пасля далучэння МТС да калгасаў і саўгасаў у 1958–1960 гг., і, як вынік, частымі былі прастоі тэхнікі. Аднак, па меркаванні В. Л. Насевіча, узровень заробку механізатараў быў меншым, чым ў дарожных рабочых, што выклікала жаданне сярод кваліфікаваных механізатараў да пераезду ў горад [10, с. 320–321]. З гэтым меркаваннем можна пагадзіцца, параўноўваючы статыстычныя дадзеныя. Сярэдні заробак механізатараў у 1962 г. складаў 47 р., у 1963 г. – 51, у 1964 г. – 55, у 1965 г. – 58. Пры гэтым сярэдні заробак па СССР у цэлым за перыяд 1962–1965 гг. знаходзіўся у межах 81 р. у 1962 г. і 93,8 р. у 1965 г. [6, с. 12–16]. Пры гэтым узровень аплаты некваліфікаваных работнікаў сельскай гаспадаркі паляводаў ў 1962–1965 гг. падрос з 15 р. да 24 р. Такім чынам, даход механізатараў у сельскай мясцовасці быў ніжэй, чым сярэдні заробак па СССР у цэлым, але значна пераўзыходзіў памер аплаты працы некваліфікаваных работнікаў сельскай гаспадаркі [14, с. 50–60]. З гэтага вынікае, што адным са спосабаў павысіць памер заробку на працы ў калгасе для палявода было атрыманне механізатарскай спецыяльнасці.

У савецкі перыяд доступ да ўладавых структур адбываўся праз удзел у кіруючай партыі КПСС або у моладзевай арганізацыі ВЛКСМ. За перыяд 1945–1958 гг. колькасць партыйных механізатараў у МТС павялічылася з 604 да 8860. У дачыненні да механізатараў саўгасаў БССР выяўляецца наступная тэндэнцыя: колькасць механізатараў-членаў КПСС-КПБ у саўгасах за перыяд 1960–1965 гг. павялічылася з 1832 да 7142 [5, с. 88–92].

За перыяд 1944–1965 гг. колькасць механізатараў камсамольцаў узрасла з 46 да 19351 чалавек. Найбольшыя тэмпы прыросту механізатараў-камсамольцаў назіралася за перыяд 1947–1952 гг., калі колькасць механізатараў камсамольцаў узрасла з 719 да 2575. Такім чынам, тэмпы прыросту камсамольскіх і партыйных арганізацый з ліку механізатараў заставаліся найвышэйшымі сярод усіх работнікаў калгасаў і саўгасаў. Удзел у партыйных і камсамольскіх арганізацыях адкрываў магчымасці атрымоўваць больш высокія пасады, працягваць навучанне ва ўстановах партыйнай адукацыі БССР [7, с. 98–99]. Пры гэтым сам факт удзелу ў партыйных і камсамольскіх арганізацыях не азначаў аўтаматычнага кар'ернага росту, а факт магчымага сацыяльнага ўздыму залежыў ад прафесійных, дзелавых і чалавечых якасцей механізатара або іншага сельскага жыхара.

Важным паказчыкам, які адрозніваў механізатара ад звычайнага работніка-паляавода, быў больш высокі ўзровень адукацыі. За 1944 г. школы сельскай механізацыі падрыхтавалі звыш 3,5 тыс. механізатараў. За 1950 г. школы механізацыі падрыхтавалі звыш 7 тыс. спецыялістаў. Школы сельскай механізацыі рыхтавалі брыгадзіраў трактарных брыгад, трактарыстаў, камбайнёраў, дызелістаў. Падрыхтоўка вялася дастаткова

хуткімі тэмпамі, паколькі адна Рудакоўская школа механізацыі ў Хойніцкім раёне за 1952 г. выпусціла 500 спецыялістаў, а да пачатку ўборачнай кампаніі планавала выпусціць яшчэ 202 спецыяліста. Таксама пры МТС дзейнічалі курсы механізацыі, якія рыхтавалі механізатараў сярод мужчын і жанчын. З 1944 г. па сакавік 1946 г. праз курсы пры МТС прайшло каля 21 тыс. чалавек, галоўным чынам яны атрымалі прафесію трактарыстаў [18, с. 15]. Са снежня 1947 г. пры Браслаўскай школе механізацыі было заснавана вучылішча. Гэта стала магчымым дзякуючы Пастанове Савета Мінстраў БССР па арaганізацыі рамесных вучылішчаў па падрыхтоўцы рабочых кадраў для МТС, МТМ, рамонтных заводаў. У 1950 г. адбылася рэарганізацыя некаторых устаноў адукацыі: Жыровіцкі сельскагаспадарчы тэхнікум стаў тэхнікумам механізацыі сельскай гаспадаркі, у Мінскім політэхнічным інстытуце быў створаны факультэт механізацыі сельскай гаспадаркі. Такім чынам, актыўная механізацыя сельскай гаспадаркі патрабавала ад механізатараў пастаяннага павышэння адукацыйнага ўзроўню [3, с. 79–87].

Адначасова захоўвалася патрэба ў механізатарскіх кадрах, якая задавальнялася вучылішчамі механізацыі. За 1955–1956 навучальны год дадзены тып устаноў падрыхтаваў 16400 чалавек. За перыяд 1954–1966 гг. вучылішчы механізацыі выпусцілі 195 850 механізатараў. Колькасць спецыяльнасцей у сельскіх прафесійна-тэхнічных вучылішчах за гэты ж перыяд узрасла да 18, папоўнілася механізатарамі меліяратыўных работ, што тлумачыцца неабходнасцю правядзення меліярацыі на землях Палесся ў той перыяд часу. У 1958–1959 гг. ва ўсіх установах вышэйшай сельскагаспадарчай адукацыі навучалася 6,2 тыс. чалавек у вочным фармаце, а прыкладна 3,4 тыс. атрымоўвалі завочную адукацыю [17, с. 133–135].

Патрэба ў механізатарскіх кадрах асабліва праявілася ў заходніх абласцях БССР падчас калектывізацыі сельскай гаспадаркі. У 1952–1953 навучальным годзе для заходніх абласцей БССР былі падрыхтаваны 5603 трактарысты, з якіх 2566 навучаліся ў школах механізацыі і 3037 на курсах пры МТС. Інтэнсіўная падрыхтоўка кадраў для сельскай гаспадаркі ў заходніх абласцях БССР прывяла да таго, што летам 1953 г. налічвалася ўжо 1888 механізатараў з 2–3 спецыяльнасцямі [2, с. 127–128].

Па меркаванні А. П. Бяляза, фактычна ў 1950-х гг. механізатары сталі сацыяльнай групай, якая была блізкай да прадстаўнікоў індустрыяльных прафесій. У цэлым, гэта датычылася не толькі механізатараў, але і іншых прафесій, якія звязаны з машыннай працай. Гэта адбывалася дзякуючы больш высокім тэмпам павышэння культурна-тэхнічнай, прафесійнай і агульнаадукацыйнай падрыхтоўкі. Найбольш падрыхтаваная частка механізатараў спалучала разумовую і фізічную працу [2, с. 143–146]. Такім чынам, на пачатку 1960-х гг., калі М. С. Хрушчовым была пастаўлена задача будаўніцтва камунізму, механізатары сталі прыкладам сацыяльнага

ўзыходжання сельскага насельніцтва БССР праз асваенне перадавой сельскагаспадарчай тэхнікі і вырашэнне ключавых для савецкай улады народнагаспадарчых задач.

Праца ў якасці механізатара з'яўлялася ў сельскай мясцовасці БССР дастаткова прэстыжнай. Прэстыж вызначаўся не толькі вышэйшым заробкам у параўнанні з паляводамі, але і тым фактам, што механізатары выконвалі народна-гаспадарчыя задачы дзяржаўнай важнасці. У першую чаргу гэта датычылася асваення цалінных зямель і паўночных раёнаў РСФСР. У красавіку 1954 г. Пленум ЦК КПБ даў даручэнне абласным камітэтам партыі і аблвыканкамам падрыхтаваць спіс 1300 механізатараў і іншых кваліфікаваных работнікаў для адпраўкі на асваенне цалінных зямель [15, с. 177–182].

Аднак у заходніх абласцях БССР, згодна успамінам механізатара У. П. Гаўрыленка, прэстыж механізатарскай прафесіі быў асэнсаваны сельскім насельніцтвам далёка не адразу. Сярод сялянства новая тэхніка ўспрымалася ў некаторых выпадках нават варожа. Камбайнёру Міхаілу Кавальчуку з в. Кавалі Свіслацкага раёна нават прыйшлося абмалочваць звязаныя снапы ўначы, паколькі жанчыны ўдзень не давалі рабіць абмалот камбайнам. У некаторых вёсках трактарыстаў сяляне не пускалі ў свае хаты, нібы з прычыны непрыемнага паху керасіна ад іх. Успаміны агранома А. І. Беляковай аб дзейнасці механізатараў таксама ўтрымліваюць сведчанні насцярожанага стаўлення сельскага насельніцтва БССР да дадзенай прафесіі. Размовы аб тым, што конь разумнейшы за машыну, выклікаліся нявопытнасцю механізатараў, якія няправільна ўстанаўлівалі глыбіню плуга. Аднак павелічэнне ўраджайнасці дзякуючы механізацыі сельскай гаспадаркі павысіла аўтарытэт прафесіі механізатара і сярод жыхароў заходніх абласцей БССР [12, с. 110–116].

Асаблівая роля ў павышэнні прэстыжу механізатарскай прафесіі сярод сельскага насельніцтва БССР належыла матэрыялам перыядычнага друку, які прадстаўлены газетамі «Савецкі селянін», «Калгасная праўда», «Советская Белоруссия». Аналізуючы перыядычны друк за перыяд 1944–1965 гг., становіцца заўважнай тэндэнцыя: калі ў канцы 1940-х гг. разам з механізатарамі ўсхваляліся і работнікі ручнога жніва, то ў 1950-х – першай палове 1960-х гг. галоўнымі героямі артыкулаў, прысвечаных жніву, былі механізатары, трактарысты і шафёры. На старонках газеты «Калгасная праўда» змяшчаліся інтэрв'ю з лепшымі камбайнёрамі, якія ў асноўным распавядалі пра паляпшэнне выкарыстання сельскагаспадарчых машын. У якасці прыклада можна прывесці нумар «Калгаснай праўды» за 1958 г., дзе камбайнёр Ляпіч бярэ абавязак у гонар 40-годдзя БССР убраць не менш за 250 га [8, с. 11].

Разам з тым перыядычны друк распавядаў не толькі аб станоўчых момантах, але і аб недахопах у працы. Карэспандэнт «Калгаснай праўды»

Ф. Станішэўскі ў рэзкай форме крытыкаваў кіраўніцтва Бярозаўскай МТС, якое замест уборкі ўраджаю займалася складаннем зводак [16, с. 13]. У другой палове 1950-х гг. колькасць матэрыялаў, якія ўсхвалялі працу механізатараў, стала змяншацца. Гэта тлумачыцца новаўвядзеннямі ў калгасах, дзе сталі ствараца комплексныя брыгады, а тэхніка пасля 1958 г. з МТС стала перадавацца непасрэдна калгасам. Перыядычны друк з 1954 г. публікаваў матэрыялы аб удзеле механізатараў ва ўборцы ўраджаю на цалінных землях. У нумары газеты «Калгасная праўда» ад 1962 г. змешчана заява механізатара з Петрыкаўскага раёна Васіля Грасько, які прасіў адправіць яго ў Кастанайскую вобласць і абяцаў апраўдаць давер камсамольскай арганізацыі [1, с. 15]. Такім чынам, перыядычны друк праз адлюстраванне поспехаў механізатараў у развіцці сельскагаспадарчых работ, а таксама ў выкананні гаспадарчых задач на цалінных землях павышаў статус механізатараў сярод чытачоў газет. На працягу 1950-х гг. колькасць артыкулаў аб механізатарах павялічвалася, але з 1958 г. адзначаецца тэндэнцыя да адлюстравання работы механізатараў разам з іншымі работнікамі сельскай гаспадаркі.

Такім чынам, статус прафесійнай группы механізатараў сярод сельскага насельніцтва БССР быў вышэйшы, чым калгаснікаў-паляводаў. Гэта адбывалася з-за больш высокага заробку механізатара, актыўнага ўдзелу ў дзейнасці камсамольскіх і партыйных арганізацый, адлюстравання поспехаў механізатараў на старонках перыядычнага друку, а таксама больш высокага ўзроўню адукацыі механізатараў. Прэстыж прафесіі механізатараў тлумачыўся не толькі больш высокім памерам заробку, але і ключавой роляй у выкананні палітыкі кіруючай партыі па ўздыму сельскай гаспадаркі. З 1958 г. пасля роспуску МТС механізатары сталі работнікамі калгасаў і саўгасаў і пачалі працаваць у складзе комплексных брыгад, пры гэтым захавалі свой больш высокі статус у параўнанні з паляводамі, заставаліся перадавікамі сельскагаспадрчай вытворчасці. Ва ўмовах механізацыі сельскай гаспадаркі, правядзення меліярацыі, асваення цалінных зямель прафесійная група механізатараў працягвала адыгрываць важную ролю, на працягу 1944–1965 гг. прэстыж дадзенай прафесіі і павага да механізатараў з боку сельскага насельніцтва пастаянна раслі. У той жа час памер заработнай платы механізатараў быў ніжэйшым, чым сярод гарадскіх рабочых на прамысловасці, што прыводзіла да жадання сельскага насельніцтва пераезду ў горад. Прафесійная група механізатараў была не выключэннем, бо па прычыне больш высокай прафесійнай падрыхтоўкі магла знайсці працу і ў горадзе.

**Спіс выкарыстаных крыніц**

1. *Бас, Н.* Па камсамольскіх пуцёўках / Н. Бас // Калгасная праўда. – 1962. – 18 крас. – С. 15.

2. *Белязо, Е. П.* Крестьянство Белоруссии на пути к развитому социализму (1951–1960 гг.) / Е. П. Белязо. – Минск: Наука и техника, 1982. – 204 с

3. *Бяляза, А. П.* Беларуская вёска ў пасляваенныя гады (1945–1950) / А. П. Белязо. – Мінск: Выдавецтва Бел. дзярж. ун-та, 1974. – 175 с.

4. *Виноградов, Г.* Лучший путь в вуз / Г. Виноградов // Калгасная праўда. – 1954. – 13 февр. – С. 13.

5. Коммунистическая партия Белоруссии в цифрах, 1918–1988 гг.: сборник / Ин-т истории партии при ЦК КПБ, Фил. Ин-та марксизма-ленинизма при ЦК КП; редкол.: В. И. Бобков [и др.]. – 2-е изд., перераб. и доп. – Минск, 1988. – 253 с.

6. *Левша, Ф. Г.* Что получат колхозники и механизаторы в порядке дополнительной оплаты за выращивание кукурузы / Ф. Г. Левша. – Минск: Изд-во ЦК КПБ, 1955. – 26 с.

7. Ленинский комсомол Белоруссии в цифрах и фактах, 1920–1980 гг.: сборник / редкол.: И. А. Сороковик [и др.]. – Минск, 1980. – 141 с.

8. *Ляпіч, К.* Мой камбайн гатоў да ўборкі / К. Ляпіч // Калгасная праўда. – 1958. – 30 ліп. – С. 11.

9. *Михнюк, В. Н.* Крестьянство Белоруссии на пути к социализму: историографический очерк / В. Н. Михнюк. – Минск: Изд-во БГУ, 1979. – 181 с.

10. *Носевич, В. Л.* Традиционная белорусская деревня в европейской перспективе / В. Л. Носевич. – Мінск: Тэхналогія, 2004. – 350 с.

11. *Патоличев, Н. С.* Отчетный доклад Центрального Комитета Компартии Белоруссии XXII съезду КПБ / Н. С. Патоличев. – Минск: Гос. изд-во БССР, 1956. – 80 с.

12. Рассвет над Неманом: Воспоминания актив. участников колхоз. стр-ва в Гродн. обл. / Ин-т истории партии при ЦК КПБ, Фил. Ин-та марксизма-ленинизма при ЦК КПСС Гродн. Обл. Компартии Белоруссии; редкол.: В. П. Верхось [и др.]. – Минск. Беларусь. – 1982. – 221 с.

13. Система образования Республики Беларусь в цифрах, 1940–1995 гг.: стат. сбор. / Министерство образования и науки Республики Беларусь. Вычислительно-аналитический центр / редкол.: В. М. Хмелевский (гл. ред.) [и др.]. – Минск: ВАЦ МОиН РБ, 1996. – 41 с.

14. *Смяховіч, М. У.* Аплата працы ў калгасах і саўгасах БССР (1944–1985 гг.) / М. У. Смяховіч // Весці Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі. Серыя гуманітарных навук. – Мінск, 2015. – № 3. – С. 50–60.

15. *Смяховіч, М. У.* Сельская гаспадарка Беларусі ў 1943–1991 гадах: этапы развіцця, дасягненні, вопыт / М. У. Смяхович. – Мінск: Беларуская навука, 2017. – 439 с.

16. *Станішэўскі, Ф.* Сур'ёзныя ўпушчэнні / Ф. Станішэўскі // Калгасная праўда. – 1958. – 6 жніўня. – С. 13.

17. Строительство коммунизма и социальные изменения в крестьянстве Белоруссии / Акад. наук Белорус. ССР, Ин-т философии и права; редкол.: А. А. Головко [и др.]. – Минск: Наука и техника, 1966. – 246 с.

18. *Чэховіч, Ф.* У школе механізацыі / Ф. Чэховіч // Калгасная праўда. – 1952. – 13 лістп. – С. 15.

**(Дата падачы: 23.02.2022 г.)**